УДК 882.6

А.У. Русецкі

«Шляхціц Завальня» Я. Баршчэўскага ў кантэксце беларускай мастацкай культуры

«Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» Яна Баршчэўскага... Наўрад ці ёсць у беларускай літаратуры, а магчыма, і ва ўсёй нацыянальнай мастацкай культуры, твор, на долю якога выпаў бы такі драматычны, нават трагічны лёс. Як зусім справядліва адзначае адзін з сучасных даследчыкаў творчасці Я. Баршчэўскага М. Хаустовіч, «хвалі мора гісторыі беларускай літаратуры то ўздымалі яго на свой грэбень, то глыбока тапілі ў падводных вірах» [1].

Сапраўды, «Шляхціц Завальня...», ды й уся творчасць Я. Баршчэўскага – паэта і казачніка з азёрнага краю – першапачаткова беларускаму, польскаму, расійскаму чытачу была прадстаўлена ў 40-я гады XIX ст. на старонках польскамоўных санкт-пецярбургскіх выданняў часопіса «Rosznik Literacki» і альманаха «Niezabudka» (першы выдаваў даволі вядомы крытык, літаратуразнаўца і выдавец Рамуальд Падбярэзскі. Ён, дарэчы, надрукаваў першыя вершы Я. Баршчэўскага і ўступны артыкул «Беларусь і Ян Баршчэўскі» да кнігі «Шляхціц Завальня»; другі – сам Я. Баршчэўскі). Але і першы, і другі завяршылі сваё існаванне ўжо да канца 40-х гадоў XIX ст. І хоць «Niezabudku» выпісвала ўся Беларусь, і мноства экземпляраў ішло таксама ў Вільню і Варшаву» [2], прозвішча беларуска-польскага пісьменніка і паэта паступова забывалася. Напомніў расійскай грамадскасці пра Я. Баршчэўскага вядомы польскі гісторык, літаратуразнаўца і выдавец Ю. Барташэвіч сваім артыкулам «Ян Баршчэўскі», надрукаваным у газеце «Dziennik Warszowski» 23 і 25 красавіка 1851 г. (на жаль, ужо пасля заўчаснай смерці творцы). На працягу амаль 150 гадоў, Я. Баршчэўскі – таленавіты пісьменнік, адзін з пачынальнікаў беларускай літаратуры – амаль не ўпамінаецца ні ў літаратуразнаўчых працах, ні на старонках газет і часопісаў (выключэннем хіба што будуць: Зямкевіч Р. Ян Баршчэўскі, першы беларускі пісьменнік. Вільня, 1911; Ен жа. «Тарас Шаўчэнка і беларусы. («Наша ніва», 1911, № 8), артыкулы віцебскага краязнаўцы 20-х гадоў XX ст. Д. Васілеўскага ды ўпамінанні прозвішча Я. Баршчэўскага ў літаратуразаўчых і этнаграфічных працах беларускіх навукоўцаў Г. Каханоўскага, І. Баса, У. Казбярука, Г. Кісялёва, А. Мальдзіса і інш.).

І толькі 90-я гады XX ст. прывялі да сапраўднага рэнесансу, актуалізацыі творчасці Я. Баршчэўскага, як з пункту гледжання літаратуразнаўчага, так і філасофска-эстэтычнага і этнаграфічнага. Выданне «Мастацкай літаратурай» (беларускае кнігавыдавецтва – А.Р.) у 1990 г. кнігі «Шляхціц Завальня» не толькі падштурхнула навукоўцаў да глыбокага вывучэння творчай спадчыны Я. Баршчэўскага, але і прывяло да прыняцця шэрагу канкрэтных арганізацыйна-практычных мер па ўвекавечванню памяці знакамітага расонца – беларуса па паходжанню і быту, паляка па адукацыі, расіяніна па падданству (Д. Васілеўскі) – Яна Баршчэўскага. У друку з'явіліся грунтоўныя артыкулы аб яго

жыцці і творчасці беларускіх аўтараў М. Хаустовіча, У. Мархеля, А. Мальдзіса. У цудоўнай серыі «Беларускі кнігазбор» у 1998 г. выдадзена кніга «Ян Баршчэўскі. Выбраныя творы»; беларускія аматары творчасці Баршчэўскага змаглі пазнаёміцца з даследчымі працамі польскіх аўтараў, прафесараў Варшаўскага універсітэта – А. Баршчэўскага і Ольштынскай педагагічнай школы – М. Яцкевіча (апошні, дарэчы, ахвяраваў грошы на ўстаноўку камня-помніка ў в. Мурагі Расонскага раёна на радзіме пісьменніка). Творчасць Я. Баршчэўскага стала больш глыбока вывучацца ў школах рэспублікі [3].

Сапраўднай канцэнтрацыяй сучасных навуковых знаходак, адкрыццяў і даследаванняў жыцця і творчай дзейнасці Яна Баршчэўскага ў кантэксце духоўнага жыцця Беларусі ў XIX-XX стст. сталі міжнародныя чытанні, прысвечаныя творчасці Яна Баршчэўскага, якія праводзяцца Віцебскім дзяржаўным універсітэтам імя П.М. Машэрава пры непасрэдным і актыўным удзеле Польскага інстытута ў Мінску і яго дырэктара Т. Нягодзіша*. Аб іх прыцягальнасці і аўтарытэце сярод навукоўцаў і даследчыкаў сведчыць колькасць удзельнікаў, якія імкнуцца выступіць з навуковымі дакладамі і паведамленнямі. Калі, напрыклад, у другіх чытаннях прыняло ўдзел 20 аўтараў, то на трэція было заяўлена амаль што 40 выступоўцаў. Мяркую, што матэрыялы гэтых чытанняў урэшце складуць калі не энцыклапедычнае, то дастаткова ўсебаковае выданне, прысвечанае жыццятворчасці Я. Баршчэўскага.

З'яўленне «Шляхціца Завальні» ў сучасным друку было не толькі другім нараджэннем твора і пачаткам новага асэнсавання непасрэдна творчасці самаго Я. Баршчэўскага. Гэта было як бы пераадоленне мяжы, адлучаючай беларускіх навукоўцаў ад такога магутнага слою нашай духоўнасці, нашага культурна-мастацкага багацця, як міфа-паэтычныя, міфалагічныя архетыпы, біблейскія і евангельскія матывы, якімі прасякнута вусная народная творчасць і якія раней так «умела» падганяліся пад атэістычнасць афіцыяльнай ідэалогіі. Дарэчы, Ян Баршчэўскі вельмі тонка ўлавіў «благоговейное» стаўленне чалавека да прыроды з усім наборам істот, ёй належачых. Ён, бадай што першым у беларускай мастацкай культуры даў дастаткова поўны пералік *міфалагічных персанажаў* («Лясун» альбо «Хохлік», «Лясны бог, пан дзікіх пустэльняў», «Волаты», «Ваўкалакі», «Нячысцік», «Цмок-лятавец», «Плачка», «Варгін», «Будзімір», «Паднор» (кашэчы, пеўневы і мышыны каралі), «Кароль Бай і ягоныя сабакі Стаўры і Гаўры», «Трасца», «Вужыны кароль»), *чараўнікоў* (вясковец Парамон, чараўніцы-жанчыны Арына і Праксэда, чарнакніжнікі – шкаляр Люцэфуга, чарнакніжнік Твардоўскі, філосаф-блюзнер), а таксама тых прыродных *элементаў і з'яў* (чорны кот, сабака, сава, кажан, жаба-рапуха і інш.), без якіх разуменне жыцця беларускага сялянства і яго светаадчування і светапогляду (па сутнасці міфалагічнага) проста немагчыма. Я. Баршчэўскі, як зусім справядліва адзначыў С. Шыдлоўскі, здолеў адлюстраваць не толькі этнаграфічную экзотыку Падзвіння Беларусі, але і выявіў дух гэтай легендарнай зямлі, здавалася, даўно згаслы...[4] (Напрыканцы 80-х гадоў тэму гэту, бадай што, найбольш актыўна даследавала толькі Таццяна Шамякіна). На наш погляд, менавіта са «Шляхціца Завальні» пачаліся шматпланавыя і дэталевыя даследаванні, літаратурна-крытычнае і філасофска-эстэтычнае пераасэнсаванне беларускай этнаграфіі, міфалогіі, дэманалогіі, іх месца і ролі ў літаратуры, мастацтве, нацыянальным фальклоры, народнай медыцыне,

---

* *Першыя чытанні адбыліся ў лістападзе 1996 г. у в. Гарбачэва Расонскага раёна (паблізу радзінных месц пісьменніка); другія – у лістападзе 1998 г. у Полацку (дзе вучыўся пісьменнік), трэція – у снежні 2000 г. у Віцебскім дзяржаўным універсітэце імя П.М. Машэрава.*

побыце народа. З'явіліся шматлікія артыкулы (асабліва на старонках газет «Культура», «Звязда», «Чырвоная змена», абласных газет, часопісаў і г.д.) па беларускай дэманалогіі, міфа-біблейскіх архетыпах і сюжэтах [5]. Грунтоўнымі дакладамі, артыкуламі па азначанай тэматыцы заявіў пра сябе вядомы беларускі філосаф, культуролаг і эстэтык Ул. Конан [6], надрукаваны шматлікія артыкулы А. Фядосіка, В. Ліцвін-кі, А. Лозкі, І. Крука, А. Ненадаўца, Я. Ленсу [7], іншых навукоўцаў. Рознымі выдавецтвамі перавыдадзены цікавейшыя працы вядомых даследчыкаў беларускай этнаграфіі і фальклору ў XIX ст. М. Нікіфароўскага, Е. Раманава і інш. Як бы па-новаму спраўдзілася ісціна, што менавіта вывучэнне народнай творчасці дапамагае паўней і глыбей прадставіць і асэнсаваць працэс развіцця літаратуры кніжнай, наогул, працэс складання і развіцця нацыянальнай мастацкай культуры. І не толькі таму, што народная творчасць – гэта пачатак, але, галоўным чынам, падмурак, на якім базуецца ўся культурна-мастацкая сістэма народа. «З псіхалагічнага пункту гледжання няма прынцыповай розніцы паміж працэсамі народнай і асабістай творчасці», – сцвярджае вядомы савецкі расійскі псіхолаг Л.С. Выгоцкі ў сваёй «Псіхалогіі творчасці» і, працягваючы сваю думку, дапаўняе: «...пачуццё першапачаткова індывідуальнае, а праз твор мастацтва яно становіцца грамадскім або абагульняецца» [8].

«Шляхціц Завальня» мае, на нашу думку, і такую дастаткова прывабную асаблівасць, як яго суаднясенне з цэласным разуменнем мастацкай культуры, як сістэмы. Даследчыкі, навукоўцы ў структуры мастацкай культуры, як правіла, выдзяляюць два вызначальныя слаі – «высокі», прафесійны і традыцыйны, народны, якія знаходзяцца ў пастаянным руху, узаемадзеянні, узаемаўплыве. Менавіта такая дыялектыка, сваеасаблівы культурны сінтэз асабовага, творчага пачатку з калектыўным, народным уласціва «Шляхціцу Завальні». Паклаўшы ў аснову свайго твора «предания простонародные» (А. Пушкін), народныя апавяданні, паданні і казачныя аповяды з элементамі фантастызму, героямі якіх былі чэрці, здані, прывіды, нячысцікі, духі, іншыя міфічныя істоты і ў якіх Я. Баршчэўскі «сустракаў пачуццё і праўду, адчуваў у іх мудрасць і малітвы цэлага народу» [9], пісьменнік стварыў цэласны, высокамастацкі твор, што назаўсёды ўвайшоў у «прафесійны» зрэз нацыянальнай мастацкай культуры. Спасціжэнне народнага светабачання і светаўспрымання акаляючай рэчаіснасці ад зямлі і да нябёсаў у арганічнай суцэльнасці, хай і ў інтуітыўна-сімвалічнай форме (якую Р. Падбярэзскі вызначыў як самую жыццёвую аснову), дзякуючы ўменню і пісьменніцкаму майстэрству Я. Баршчэўскага, дазваляе бачыць, як на аснове асабовага, аўтарскага сінтэзу, канвергенцыі дзвюх ментальнасцей – язычніцкай і хрысціянскай (ідэі дабра і зла, маральных цнотаў і грахоў, гуманізма, духоўнасці) узнікла філасофска-эстэтычная аповесць, арганічна спалучаючая этнаграфічнае з сацыяльным, міфалагічнае з сучасным, рэальнае з фантастычным, мясцовае з патрыятычным. Па сутнасці, перад чытачамі прадстала непаўторная кніга, якую некаторыя аўтары параўноўваюць з сусветна вядомай «Тысячай і адной ноччу» (Ігн. Галавінскі і інш.). І, нават, калі гэта не «Тысяча і адна ноч», гэта ўсе ж адна з цікавейшых і першых кніг на Беларусі, правільней, той яе паўночна-ўсходняй частцы, «дзе прырода ўзняла высокія горы, быццам паверхні велізарных гмахаў, якія стагоддзі пакрылі ценем лясоў, а некаторыя пад пагодным сонцам ззяюць залатым пяском. Якія там разнастайныя краявіды, якія цудоўныя малюнкі! Калі хто, будучы ў гэтым краі, ўзышоў на вяршыню Пачаноўскай гары і глядзеў на дзікія ваколіцы, што ляжаць навокал, дык бачыў, як азёры тут і там, нібы люстэркі, адбіваюць дзённы прамень, а над іх берагамі дрэмлюць густыя лясы, як дзе-нідзе па схілах чарнеюць бедныя сялянскія хаціны; але не ўбачыш тут нідзе ні

гарадскіх муроў, ні вежаў старога замка. ...Там вясна-рай; самыя розныя птушкі, здаецца, збіраюцца з усіх канцоў свету; тысячы розных меладычных дзікіх і чуллівых галасоў адгукаюцца над вадою па лугах і лясах: енк зязюлі, пошчак салаўёў, голас бугая ў чароце, рэзкія крыкі качак...» [9, с. 12].

Сваю любоў да «малой радзімы», да тых месц, дзе радзіўся і вырас, дзе спазнаў народную мудрасць і пабачыў народнае гора, Я. Баршчэўскі выразіў у наступных радках:

Край мой, дзе горы паўсталі ўзнёсла,
Край сініх вод, чаратамі зарослых,
Пушчаў, дзе ў голлі хаваецца сонца,
Колькі прыгадак ты будзіш штодзённа,
У промнях вясновых, у барвах зялёных
Ты мне з'яўляешся казкай бясконцай.
Згадваю сумную песню ратая
Ці пастуха, што па-простаму грае,
Часам, калі ў лясах ля азёраў
З кобзаю рэха гамоніць паўторам,
Ці калі люд пасля дзённае працы
Гучна спяшае ля хаты сабрацца,
Чуючы мяккі палон прахалоды,
Слухаць ад старца сівога прыгоды
Прашчураў слынных, асілкаў, герояў.
Слава і дзіва паданне старое,
Што аж ад продкаў па бацькавым краі
З вёскі да вескі вандруе, блукае! [9, с. 19]

(Пераклад С. Сокалава-Воюша).

Прыведзеныя радкі зусім лагічна падводзяць нас у сваіх разважаннях да вельмі важнай праблемы ў творчасці Я. Баршчэўскага – да яго беларускасці, яго патрыятызму і білінгвізму. Літаратуразнаўцы, як правіла, канцэнтруюць сваю ўвагу на творчым метадзе пісьменніка, трактуючы яго як рамантызм (праф. А. Баршчэўскі, В. Бароўка, М. Яцкевіч, В. Рыхлова і інш.), «дыскрэтны рамантызм» (Л. Сінькова), «гофманаўскі рамантызм» (Р. Падбярэзкі) ці сентыменталізм (У. Арлоў). Але, калі падняцца на больш высокую ступень абагульнення – філасофска-эстэтычную, то можна ўбачыць з'яву больш шырокую і пераканальную, а менавіта – патрыятызм, прасякнутасць творчасці (асабліва бачна гэта ў «Шляхціца Завальні») тым агульначалавечым пачаткам любові да сваёй «малой радзімы», без якога ўсе іншыя праявы творчай асобай асабістага характару, пачуццяў, эмоцый як бы губляюць сэнс.

Такое ж цэльнае замілаванне беларусамі і Беларуссю знаходзім мы ў лістах Я. Баршчэўскага. «У яго лістах, пісаных па-польску, – адзначаў Д. Васілеўскі, – няма Польшчы, а цэльнае замілаванне беларусам і Беларуссю» [10].

У творах пісьменніка і паэта мы не адшукаем узнёслых апісанняў Варшавы ці Кракава, Нявы ці Віслы, але можна прачытаць шчырыя радкі закаханага ў свой край чалавека пра старажытны Полацк, магутную Дзвіну, хуткаплынную Дрысу, дзівоснае возера Нешчарда. Не можа Я. Баршчэўскі знайсці словы, каб параўнаць «самую вытанчаную музыку з пяшчотным і чароўным спевам салаўёў і самотным голасам зязюль» і для яго «дзікія лясы мілей за пышныя паркі». Дарэчы, адносіны пісьменніка да «малой радзімы» адназначна-канкрэтныя. Нягледзячы на забарону ў 1840 г. ужывання ў афіцыйных дакументах і паперах слоў «Беларусь» і «беларускі», ён і ў перадумове да «Шляхціца Завальні» – «Колькі слоў ад аўтара» і ў «Нарысе Паўночнай Беларусі» (надрукаваны Р. Падбярэзскім у «Roszniku Literackiem» за 1843 г.,

амаль за год да з'яўлення «Шляхціца Завальні» – А.Р.) адкрыта заяўляе аб «беларускім народзе», «паўночнай Беларусі», «жыхарах Беларусі», аб купальскай ночы «у тым баку Беларусі», выкарыстоўвае беларускія народныя песні і друкуе іх на беларускай мове. Адзначаючы такую асаблівасць, ужо першыя даследчыкі творчасці Я. Баршчэўскага не адносілі яе ні да «крэсавай», ні да «западнорусистской» (а менавіта так будавалі свае даследчыя канцэпцыі ў сярэдзіне XIX ст. рускія і польскія даследчыкі Беларусі), а падкрэслівалі яе беларускую прыналежнасць і самабытнасць (напрыклад, наш зямляк, краявед і навуковец 20-х гадоў XX ст. Д.М. Васілеўскі). Ужо ўпомнены намі ксёндз Ігнат Галавінскі ў пісьме да ўплывовага польскага крытыка і пісьменніка кансерватыўнага кірунку Міхаіла Грабоўскага, падкрэсліваючы беларускую прыроду таленту пісьменніка, адзначаў: «Пан Баршчэўскі паўстае перад намі самым дасканальным выразнікам прастанароднае фантастычнасці ды звычаяў *беларускага* народа... Мова зусім простая, не польская, а *беларуская* – у кожным слове быццам чуеш *беларуса* (выдзелена намі – А.Р.). Гэта «шчыры беларус», у «Шляхціца Завальні» якога: «Усе ...выканана па-майстэрску пад выглядам найвялікшае прастаты» [10, с. 19].

Адзначым і такія, на наш погляд, значныя адметнасці, якія характарызуюць патрыятычныя пачуцці Я. Баршчэўскага. *Па-першае*, гэта разуменне ім адпаведнасці мовы, стылю і будовы літаратурных твораў таму ўздзеянню, якія яны маглі аказаць на чытача. Аб чым у перадумове да кнігі ён шчыра прызнаўся чытачу, што «не пераймае формаў, якія любілі пісьменнікі англійскія, нямецкія або французскія; лічу, што чужаземнае не будзе пасаваць негаваркому жыхару Беларусі» [11]. І таму ён выбраў жанр прытчы, які выразіў праз больш зразумелы чытачу (а мабыць, і з мэтай пераадолення цэнзурнага «грэбня») матыў гасцявання з элементамі «бяседы як застолля і як гутаркі, размовы» (Н. Панасюк). *Па-другое*, праяўленне любові да родных месцаў, да векавой, занітаванай у народнай мудрасці, духоўнай спадчыны, якая бераглася самымі рознымі сацыяльнымі слаямі тагачаснага насельніцтва Беларусі. Таму і ўдзельнічаюць у гасцяваннях-гутарках у расонскага Шляхціца Завальні сяляне, шляхціцы, падарожнікі, суседзі, нават прадстаўнік цыганскага племя. Праз іх асабіста-гістарычную памяць, праз спалучэнне рэальнага жыцця, у якім прабываюць і гаспадар, і яго госці, з фантастычна-алегарычнымі вобразамі «народных апавяданняў» (паданні, легенды, казкі, песні) пісьменнік падводзіць чытача да разумення нацыянальнага характару беларусаў, іх побыту, традыцый і звычак.

Важкім дапаўненнем да агульных характарыстык народнай ментальнасці стала выкарыстанне Я. Баршчэўскім такіх народна-паэтычных элементаў, як прыказкі, прымаўкі, замовы, прыкметы надвор'я, народнай медыцыны і г.д. Пры гэтым, сустракаюцца і больш і менш вядомыя, і толькі характэрныя для Расонскага краю. Вось толькі некаторыя з іх. *Больш вядомыя* – «Вот ужэ страх так страх, аж мароз па скуры падзіраець», «Цярэшку бяда стала з кім яго жына спала», «Калі пасеяна, дык трэба і жаць», «Век звекаваць – не пальцам паківаць», «Пазнай роўны роўнага, будзе пара поўная», «Сабакі брэшуць, а вецер носіць», «Вочы, як у ваўка свецяцца», «Пра пана памоўка, а пан на парог», «Хто працуе, таму і Бог дапамагае», «Як сабе пасцелеш, так і выспішся» і ў іншай рэдакцыі: «Добра дурню, як паслаў, так і выспаўся», «За дурной галавою і нагам няма спакою»; *менш вядомыя* – «Бяда таму, хто прагнучы багацця прадае сваю душу пеклу», «Не затрымае чалавек захаду сонца, каб дзень падоўжыць», «Смерць сама да нас прыйдзе», «Што каму лёс прызначыў, так і будзе», «Свет нам пілігрымка, а неба напамін», «Там толькі шчасце, дзе чалавек жыве так, як Бог загадаў», «Малады маецца, а стары

паміраць мусіць» і інш. Асабліва адзначым, арганічна ўпісаныя ў тэкст, *народныя прыкметы*. Да месцу будзе прывесці некаторыя з іх. «Калі апоўнач шмат зорак на небе і вецер сціх, заўтра будзе добрае надвор'е», «Улетку, калі певень праслявае, як сонца садзіцца, дык ужо назаўтра раніцою абавязкова дождж», «Калі напрыканцы снежня і напачатку студзеня бывае бура і снег глыбокі, дык улетку багата травы на лугах і буйнае збожжа вырасце на ніве», «Калі з пашы першай вяртаецца черная карова, дык неадменна будзе навальніца, калі ж белая – яснае надвор'е». Ёсць і *адметныя*, якія не часта сустракаюцца ў беларускім фальклоры. Напрыклад, «Хто сее жалуды ці садзіць дуб, і года не пражыве», «Калі шум у галаве мучае, найлепей пастаяць ля самае званніцы, паслухаць касцёльных званоў, як на імшу звоняць, потым зайсці ў святыню, укленчыць перад алтаром, шчыра памаліцца і паслухаць святую імшу» [9, с. 8].

«Шляхціц Завальня» у беларускай мастацкай культуры займае адметнае месца і яшчэ па адной прычыне. Менавіта гэты твор увёў у мастацкае жыццё такія непаўторныя вобразы, як «Плачка» і «Белая Сарока». Чаму з'явіліся гэтыя вобразы-сімвалы ў «Шляхціцы Завальні»? Пісьменнік дае зразумець, што ў іх аснове ляжала забітасць тагачаснага жыцця, якая і параджае нядобрых духаў на карысць злым панам і ўсім непрыяцелям простага люду. І выйсця з гэтай забітасці пісьменнік не бачыў. Але ж яго разуменне цудадзейнай сілы лясных, вадзяных, палявых і дамавых «уладароў» дае дазваленне прадставіць, што пісьменніку патрэбен быў вобраз, які мог бы процістаяць усім «нядобрым духам». І вось яны – «Плачка» (Апавяданне шостае «Плачка» і расповед сляпога Францішка «Сын Буры») і «Белая Сарока» (апавяданне восьмае «Белая Сарока»). Рознымі яны прадстаўлены чытачу: Плачка – «мастацкае ўвасабленне тугі па слаўным мінулым краю» (В. Русілка) – самотная, жаласная, са слезамі на вачах ходзіць «па усім краі» і ...параджае ў людзей самыя розныя пачуцці: у старых, што яна нясе нешта дрэннае, у маладых – надзею на паляпшэнне жыцця, на абагачэнне; Белая ж Сарока узнагароджвае ды робіць шчаслівымі толькі тых, «хто спрыяе ёй» (як высвятляецца, гэта былі толькі багатыя, заможныя людзі, а для бедных толькі зло, якое «распаўзлося па ўсім наваколлі»). Два сімвалічныя, лепш сказаць, алегарычныя вобразы. Па-рознаму іх можна ўспрымаць і тлумачыць. І калі «Белая Сарока» – гэта замаскіраванае белым колерам зло (ад чаго яшчэ больш вытанчанае, а значыць, і больш небяспечнае), дык «Плачка» – тут нельга не пагадзіцца з М. Хаустовічам – гэта Беларусь, што апякуецца над «сваімі нешчаслівымі дзецьмі», якія не разумеюць яе» [12]. (Сам шляхціц Завальня выкажацца пра такіх людзей зусім канкрэтна: «Яны за золата прададуць усё тое, што нашы бацькі цанілі некалі даражэй за жыццё» [9, с. 134].).

Плачку адны не могуць, другія не хочуць зразумець. Тым, хто адвярнуўся ад Плачкі-Беларусі, «непатрэбна Яе Жывая вада, што, пэўна, не аднаму абудзіла ягоную нацыянальную самасвядомасць». «Паны і шляхта нічога не хочуць ведаць пра Плачку, пагадліва глядзяць на сялянскую сірату, – піша М. Хаустовіч. – Наадварот, яны звязваюцца з чарнакніжнікамі, аддаюць свой край пад уладу Белае Сарокі, гаспадыні Паўночнае краіны (выдатны алегарычны вобраз Кацярыны II !), а самі ў вобліку мядзведзяў вартуюць яе багацці; яны наводзяць на Беларусь асташоў, якія нішчаць прыроду ды псуюць норавы люду» [13].

«Шляхціц Завальня» Я. Баршчэўскага – добры прыклад таго, як на аснове спалучэння асветніцкага і народнага ў культуры, выкарыстання нацыянальна-культурнага вопыту іншых народаў (у дадзеным выпадку – Расіі і Польшчы) можа злажыцца новая мастацкая якасць, глыбока прасякнутая нацыянальнымі матывамі. І, бадай што, мае рацыю А. Мальдзіс, які лічыць, што на Беларусі

унікальныя з'явы і творы мастацай культуры ўзнікалі там, дзе перасякаліся межы дзвюх вялікіх макракультур (у нашым выпадку – праваслаўна-візантыйскай і каталіцка-пратэстанцкай). На Віцебшчыне – гэта і унікальны Полацкі духоўна-культурны комплекс (ад Еўфрасінні Полацкай і Сімеона Полацкага да Полацкай Іезуіцкай Акадэміі), і Аршанска-Куцеінская Лаўра (ад Ф. Кміты Чарнабыльскага праз дзейнасць куцеінскіх асветнікаў да Т. Зана) і Віцебскія набыткі ў галіне архітэктуры, літаратуры, жывапісу.

Асаблівасці творчасці Я. Баршчэўскага для беларускай мастацкай культуры, як нам бачыцца, і заключаюцца ў тым, што менавіта яна на пачатку складання нацыянальнай самасвядомасці беларусаў спрыяла, па-першае, актуалізацыі этнічных вытокаў мастацкай культуры праз прыцягненне беларускага фальклора ў якасці сюжэтна-тэматычнай асновы творчасці; па-другое, у рэгенерацыі народных і класічных форм культуры і, па-трэцяе, у разуменні адкрытасці фальклорна-этнічнай традыцыі, яе ўзаемадзеянні з іншымі суб'ектамі еўрапейскага культурна-мастацкага працэсу на карысць развіцця нацыянальнай мастацкай культуры.

ЛІТАРАТУРА

1. ***Хаустовіч М.*** Каля самых вытокаў // ***Баршчэўскі Я.*** Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях. Мн., 1990. С. 367.
2. ***Барташэвіч Ю.*** Ян Баршчэўскі // ***Баршчэўскі Я.*** Шляхціц Завальня або Беларусь у фантастычных апавяданнях. Мн., 1990. С. 363.
3. ***Верціхоўская В., Верціхоўская М.*** Цуды можна разумець толькі сэрцам (з вопыту вывучэння творчасці Яна Баршчэўскага ў школе) // Ян Баршчэўскі і яго час. Віцебск, 1999.
4. ***Культура***. 1994, 28 вер.
5. ***Культура***. 1992, 5 кастр.; 1993, 22 сак., 16 ліст., 29 сн.; 1994, 5 студз., 22 сак., 27 крас., 4 мая, 10 мая, 16 ліст., 29 сн.; ***Звязда,*** 1998, 3 сак., 17 сак. і г.д.
6. ***Конан У.М.*** Ля вытокаў самапазнання: Станаўленне духоўных каштоўнасцей у святле фальклору // Культура. Мн., 1989. Яго ж: Сучаснасць і фальклорная культура // Культура, 1992, 26 кастр. Яго ж: Бытие и слово. Библейские мотивы в белорусской литературе // Неман, 1999, № 4.
7. ***Ненадавец А.*** Вадзянік // Культура, 1993, 16 ліст.; ***Фядосік А.*** Нячысцік // Культура, 1994, 18 мая; Яго ж: Лесавік // Культура, 1994, 9 лют.; ***Кухаронак Т.*** Прыйшлі Грамніцы, скідай рукавіцы // Звязда, 1998, 3 сак. і інш.
8. ***Выготский Л.С.*** Психология искусства. М., 1965. С.318.
9. ***Баршчэўскі Я.*** Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях. Мн., 1990. С. 170.
10. ***Акуневіч В.Д.*** Васілеўскі – даследчык творчасці Яна Баршчэўскага // Ян Баршчэўскі і яго час. Віцебск, 1999. С. 5.
11. ***Баршчэўскі Я.*** Выбраныя творы. Мн., 1998. С. 1.
12. ***Хаустовіч М.*** Ля вытокаў беларускае ідэі // Полымя, 1999, № 11. С. 174.
13. ***Хаустовіч М.*** // ***Баршчэўскі Я.*** Выбраныя творы. Мн., 1998. С. 367.

SUMMARY

The author expertly analyzes ideological and esthetic aspects of the work «Nobleman Zavalnya» on the basis of the profound studies of Yan Barshchevsky's literary activity by ethnographers, philosophers and literary critics. He draws convincing conclusions about the uniqueness of this literary work and its importance for the development of the national culture.

Поступила в редакцию 7.02.2001